





















ён ёга ёгурт
















| | |
|---|---|
| ён | мой |
| яна́ | мая́ |
| яно́ | маё |
| яны́ | мае́ |







с л м а і ы у ў г п т о э р ч н



Як ра́на ўста́ла
со́-ней-ка!



Ты маё
со́нейка!



Ма́ма люля́ла мало́га сы́на і пе́ла яму́: «Лю́-лі, лю́-лі! Спі, маё со́нейка!»

Ге́на тэм-пе-ра-ту́-рыў і пла́каў. Як су́мна!

Ма́ма пасла́ла та́ту ў аптэ́ку па ле́кі, а Але́нку — у кра́му.

Тату́ля купі́ў ле́кі, а Але́нка — ёгурт.

Ге́ну напаі́лі сі-ро́-пам. Ён су-па-ко́-іў-ся.



По́тым ма́ма і Але́нка пяклі́ по́нчыкі. Усе́ е́лі по́нчыкі і пілі́ чай. А малы́ Ге́на еў ёгурт і піў морс. Як прые́мна!



Чаму́ Ге́на пла́каў?
Чым яму́ памо́г та́та?
Як памага́ла Але́нка?

к й я ю е ё



Правообладатель Академия образования










нос



нёс

| | |
|---|---|
| ло | лё |
| мо | мё |
| со | сё |
| го | гё |
| по | пё |
| но | нё |
| ко | кё |

лён
клён
клёнік

мёў
сумёт
сумёты

палёт
самалёт
лётчык

анёл
імёны
сёмы

сёння
сёлета
сёлетні

плёс
плёск
усплёск

## Парк гісто́рыі Сула́



Сёння ў нас пра-гу́л-ка ў маёнтку Сула́. Тут парк, рэ́чка Сула́, пако́і, ста́йня і ган-ча́р-ная май-стэ́р-ня.



Гэ́та ста́йня.
У ста́йні ко́ні.



с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

| | | | |
|---|---|---|---|
| Пётр | пёк | куры́ны | акуля́ры |
| Лёня | пе́кар | ку́рнік | акулі́ст |



Пётр — пе́кар.
Пірагі́ ў Пятра́ — смаката́!
Учо́ра ён пёк ку́рнік.
А сёння Пётр пячэ́ сма́чныя кулічы́.



Лёля — ура́ч-акулі́ст.
У яе́ на прыёме Лёня.
— На, Лёня, акуля́ры!



Аляксе́й — піло́т. Сёння ў палёт. Яго́ лёгкі самалёт на лётным по́лі. Аляксе́й сеў у самалёт. Старт!


Пятля́.


Го́рка.


Піке́.

Аляксе́й — лётчык-ас!

к й я ю е ё



Правообладатель Академия образования